# Аб ініцыятыве і пачуцці новага ў рабоце

*І. Палякоў,*
*першы сакратар Гомельскага абкома КП Беларусі*

XXI з'езд КПСС адкрыў перад савецкім народам велічныя, хвалюючыя перспектывы. З'езд падвёў вынікі гаспадарчага і культурнага будаўніцтва ў нашай краіне, намеціў праграму гіганцкай работы на бліжэйшыя 7 гадоў, указаў канкрэтныя шляхі і спосабы вырашэння задач у перыяд разгорнутага будаўніцтва камуністычнага грамадства. Як і ўсе савецкія людзі, працоўныя Гомельскай вобласці горача адабраюць рашэнні з'езда і аднадушна заяўляюць, што не пашкадуюць сіл для паспяховага ажыццяўлення гістарычных прадвызначэнняў сваёй роднай Камуністычнай партыі. На фабрыках, заводах, у калгасах, саўгасах і ўстановах ідзе ўсебаковае і ўважлівае вывучэнне матэрыялаў XXI з'езда. Працаўнікі горада і вёскі выяўляюць нявыкарыстаныя рэзервы, вызначаюць свае задачы і сваё месца ў агульнанароднай барацьбе за далейшыя поспехі ў камуністычным будаўніцтве.

Ва ўмовах напружанай барацьбы за ажыццяўленне вялікіх і складаных задач сямігадовага плана асабліва значэнне ў рабоце партыйных арганізацый набывае пачуццё новага і творчы падыход да справы, іх уменне знаходзіць і выкарыстоўваць унутраныя рэзервы павышэння прадукцыйнасці працы, зніжэння сабекошту і паляпшэння якасці прадукцыі. У выніку прынятых партыяй мер, асабліва пасля XX з'езда КПСС, перад партыйнымі арганізацыямі адкрыліся вялікія магчымасці для праяўлення ініцыятывы і самастойнасці ў вырашэнні важнейшых задач гаспадарчага і культурнага будаўніцтва. Пранікаючыся ўсё большай адказнасцю за гаспадарчае будаўніцтва, яны пачалі глыбей займацца пытаннямі эканомікі, тэхнікі вытворчасці, арганізацыі працы, палепшылі арганізатарскую і палітычную работу ў масах. У кіраўніцтве гаспадаркай стала больш дзелавітасці, аператыўнасці, канкрэтнасці.

Шмат павучальнага ёсць у дзейнасці Навабеліцкай раённай партыйнай арганізацыі горада Гомеля. Праяўляючы ініцыятыву і настойлівасць, райком партыі своечасова заўважае і актыўна падтрымлівае ўсё каштоўнае, што нараджае творчая энергія рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў, змагаецца з адсталым, аджываючым, што тармозіць рух уперад. Прадметам асаблівых клопатаў партыйнай арганізацыі раёна з'яўляецца шырокае разгортванне руху рацыяналізатараў і вынаходнікаў. Творчая думка наватараў накіроўваецца на ўдасканаленне дзеючага і стварэнне новага вытворчага абсталявання, паляпшэнне тэхналагічных працэсаў. Так, на дрэваапрацоўчым камбінаце адходы драўніны да нядаўняга часу спальваліся ў топцы. Гэтае пытанне абмяркоўвалася на партыйным сходзе. Было вырашана арганізаваць выкарыстанне адходаў для вытворчасці мэблі. Камуністы тт. Гушчо, Стрыжэўскі, Казлоў, Шаўцоў і іншыя ўклалі шмат працы і энергіі, каб у кароткі тэрмін змантыраваць паўаўтаматычную лінію для вырабу сталярнай пліты з адходаў драўніны. У выніку пуску гэтай лініі ў 1958 годзе зроблена больш

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы